**Канспект занятка па адукацыйнай вобласці “Мастацтва” (маляванне)**
**у рознаўзроставай групе**

# Тэма: **«Рамонкавае поле»**

Выхавацель 1 катэгорыі
Макевіч В. Г.

**Задачы:**

- вучыць дзяцей маляваць кветкі гуашшу, выкарыстоўваючы ватовыя палачкі;
- вучыць разумець, што паэты ў вершах перадаюць прыгажосць кветкі;
- замацаваць веды аб палявых кветках;
- замацаваць веды аб частках рамонка (сцябло, лісце, кветка); в
- ыклікаць жаданне перадаваць прыгажосць убачанага ў малюнку;
- развіваць эстэтычныя пачуцці, цікавасць да стварэння выразных вобразаў прыроды.

**Матэрыял:** ліст паперы фармату А8; пэндзлік; ватовыя палачкі; гуаш (каляровая); ілюстрацыі з выявамі палявых кветак, музычнае суправаджэнне «Вальс кветак» П.І. Чайкоўскага.

**Ход занятку:**

Сюрпрызны момант:

- Дзеці да нас у дзіцячы сад прыйшоў ліст. Зараз я вам яго прачытаю. (Чытаю ліст).

*«Дарагія, дзеці! У нас у кветкавым горадзе адбудзецца мастацкая выстава. У ёй прымуць удзел мастакі з розных краін і гарадоў. Я спадзяюся, вы таксама дашлеце нам свае работы, каб прыняць удзел у выставе*

*З павагай, Мастак-Чараўнік горада Кветак»*

-Скажыце, А якія кветкі вы ведаеце? Якія кветкі растуць у поле?

-Я Зараз вам загадаю загадкі, а вы павінны адгадаць іх (загадкі) (знайсці сваю кветку)

Загадкі:



1. Жоўтым колерам цвіце,
Радуе ўсім вока.
Адцвіце – пушынак рой
Паляціць далёка (Дзьмухавец)

2. У чырвоны шоўк я апранаю стэпы
І даю назву цукерцы. (Мак)

3. Сіненькі званок вісіць,
Ніколі ён не звініць. (Званочак)

4. Стаіць ўжыце і здалёк
Пяшчотай вабіць …(Васілёк)

5. Вось палянка, уся ў кветачках,

Нібы ў светла-сініх кропках.
Збяру тут для Анюткі
Блакітныя (Незабудкі)

6. На сцяблінку сонца села,
Белы капялюш надзела.
У траве ўсміхаецца,
Дзеткам падабаецца. (Рамонак)

- А як вы думаеце, ці можна рваць кветкі?

Калі я сарву кветку,
Калі ты сарвеш кветку,
Калі ўсё: і я, і ты,
Калі ўсё сарвем па кветцы,
Апусцеюць ўсе паляны
І не будзе прыгажосці.

-Скажыце мне, калі ласка, чаму нельга рваць кветкі?

-А Вам падабаецца як квітнеюць кветкі?

-А як паэты могуць перадаць прыгажосць кветак? *Дзеці чытаюць вершы.*

- Пра якую кветку Ілля прачытаў верш? *(Рамонак)*

-Як Выглядае рамонак. З якіх частак складаецца кветка? *(Сцябло, лісце, кветка) (сузіраньне рамонкі на малюнку, яе будынак)*

-Давайце Мы сёння з вамі намалюем рамонкавыя палі, але спачатку я прапаную пагуляць у пальчыкавую гульню «Кветкі».

Нашы белыя кветкі
Выпростваюць пялёсткі.
Ветрык ледзь дыхае,
Пялёсткі калыхае.
Нашы белыя кветкі
Закрываюць пялёсткі,
Галавой ківаюць,
Ціха засынаюць.



-Малайчынкі, дзеці, вы былі прыгожымі кветкамі.

- А зараз, я нагадаю як трэба маляваць. Спачатку ватовай палачкай намалюем жоўтую сярэдзіну рамонкаў, затым белай фарбай намалюем пялёсткі кветкі. Для гэтага нам трэба прыкладваць ворс пэндзіка кругам, вакол жоўтай сярэдзінкі.

Затым, зялёнай фарбай сцяблінку і лісты. Не забывайце, што пасля кожнага колеру трэба прамываць пэндзлік і прамакаць яе анучкай. Нагадваю, што трэба не спяшацца і ўсё рабіць акуратна. А каб вам было не сумна маляваць, паслухайце, калі ласка, «Вальс кветак» П.І. Чайкоўскага.

*Выкананне работ дзецьмі.*



Вынік: - Што мы сёння малявалі? А якія гэта кветкі: садовыя ці палявыя? Пазней мы адправім поштай вашы работы у горад Кветак на выставу. І ў канцы нашага занятку я хачу прачытаць вам верш.

Не рвіце кветкі, не рвіце!
Хай будзе ўбранне ў зямлі,
А замест букетаў дарыце-
Рамонкавыя палі!

# Вершы

1. Краску клічуць пустазеллем:
рвуць усе, ніхто не сее.
Пчолкі ў жыта залятаюць,
неба кропелькі шукаюць.
Ведае, напэўна, кожны
Нашы сціплыя **валошкі**.

2. У траве ў зялёнай свіце
Да ўзыходу сонца спіць ён.
А як сонейка вітае – золатам кашуля ззяе.
Раптам зробіцца надзьмуты
У пухнатым белым футры.
А пад ветрам гайданецца –
Дык у момант распранецца.
Што за модны маладзец?
Ну, вядома ж, **дзьмухавец**!

3. Жоўтае сонейка ў белых пялёстках –
Кожны з нас ведае кветачку простую.
П’ем з ёй гарбату (прастуда міне),
З ёю варожым (кахае ці не).
Дык пра якія тут кветкі гамонка?
Ты здагадаўся? Вядома ж, **рамонкі**!

4. Паўсюль вы сустрэнеце гэтыя кветкі:
Блакітныя вочкі і жоўтыя зрэнкі.
На лузе, у лесе, па ўскрайку балота
Растуць яны дружна. Збірай у ахвоту. **(Незабудкі)**

5. Красавала, чырванела
кветачка на градках.
Як пялёсткі абляцелі - засталася хатка.
Патрасеш - яна звініць.
Хто у хаціне той сядзіць?
Булкам адмысловы смак
надае звычайны **мак**.